*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі універсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна

№ 12 (357) | Субота, 21 сакавіка 1959 года | Цана 20 кап.

## У ДОБРЫ ЧАС!

У дакладзе М. С. Хрушчова на XXI з'ездзе КПСС адзначаецца, што наша краіна як па агульнаму ліку, так і па разліку на кожную тысячу насельніцтва займае першае месца ў свеце па колькасці спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй. У прынятай на з'ездзе рэзалюцыі прадугледжваецца значнае павелічэнне ліку спецыялістаў, якія выпускаюцца вышэйшымі і сярэднімі спецыяльнымі навучальнымі ўстановамі.

Беларускі універсітэт у гэтым годзе дасць краіне ў лік выканання сямігадовага плана 1132 высокакваліфікаваных спецыялістаў рознага профілю. Радасна адзначыць, што выпуск гэтага года з'яўляецца найбольшым за ўсе гады дзейнасці нашага універсітэта. У народную гаспадарку краіны будзе напраўлена першы раз звыш сотні хімікаў і каля ста матэматыкаў.

Рэктарат, дэканаты і грамадскія арганізацыі універсітэта ўжо прарабілі вялікую падрыхтоўчую работу да прадстаячага размеркавання маладых спецыялістаў: выпускнікі універсітэта пазнаёмлены з палажэннем аб парадку напраўлення на работу заканчваючых ВНУ, праведзены камсамольскія і прафсаюзныя сходы пяцікурснікаў, падрыхтавана неабходная дакументацыя на заканчваючых.

Размеркаванне на работу ў гэтым годзе праводзіцца дзвюма зацверджанымі МВА камісіямі—адна па гуманітарных спецыяльнасцях, другая—па прыродазнаўчых.

Значная частка выпускнікоў будзе накіравана для работы выкладчыкамі ў сярэднія школы і спецыяльныя навучальныя ўстановы. Многія выпускнікі матэматычнага і фізічнага факультэтаў будуць накіраваны для работы ў навукова-даследчыя інстытуты і аддзелы АН БССР, вылічальны цэнтр, канструктарскае бюро і лабараторыі заводаў. Установы савецкіх і партыйных органаў, суды і пракуратура атрымаюць нашых гісторыкаў, журналістаў, філолагаў, юрыстаў.

Найбольш падрыхтаваная частка выпускнікоў па рэкамендацыі Вучоных саветаў факультэтаў будзе пакінута для вучобы ў аспірантуры універсітэта.

Пры размеркаванні на работу таго ці іншага спецыяліста камісіі будуць улічваць перш за ўсё ўзровень падрыхтоўкі па спецыяльнасці заканчваючага, яго магчымасці справіцца з работай, на якую яго прызначаюць. Нельга, аднак, не ўлічваць пры гэтым, як сябе зарэкамендаваў выпускнік у грамадскай і камсамольскай рабоце, яго палітычную і ідэалагічную падрыхтоўку, паводзіны ў быту і калектыве.

Будзем спадзявацца, што ў гэтым годзе не будзе выпадкаў адказу ад накіравання на работу, прапануемую камісіяй па размеркаванню, як гэта было ў мінулыя гады. Так, некаторая маласвядомая частка маладых спецыялістаў спрабавала рознымі шляхамі адмовіцца ад паездкі на работу ў сельскую мясцовасць, патрабуючы прадастаўлення работы толькі ў г. Мінску.

Грамадскім арганізацыям патрэбна растлумачыць такім таварышам іх нядобрасумленныя паводзіны, пераканаць у тым, што выкананне задач па будаўніцтву камунізма ў нашай краіне патрабуе кваліфікаваных кадраў інтэлігенцыі там, дзе яны найбольш патрэбны для вырашэння важнейшых задач у справе падняцця агульнага і культурнага ўзроўню сельскага насельніцтва.

Неабходна стварыць невыносныя абставіны вакол такіх спецыялістаў-пустацветаў.

Віншуем выпускнікоў універсітэта са знамянальнай падзеяй у іх жыцці за час навучання—размеркаваннем на работу—і жадаем ім пасля паспяховай абароны дыпломных работ і здачы дзяржаўных экзаменаў выдатных поспехаў у выкананні сваіх абавязкаў па даручанай рабоце, каб з гонарам апраўдаць званне спецыяліста нашага універсітэта.

Будзем спадзявацца, што нашы выхаванцы, дзе б яны ні працавалі пасля заканчэння, будуць падтрымліваць цесную творчую і дзелавую сувязь с кафедрамі універсітэта, дзе яны заўсёды знойдуць чулыя адносіны, патрэбную дапамогу і параду ў іх практычнай рабоце.

**А. МАЛЫШАЎ,**
прарэктар па вучэбнай рабоце.

# Па універсітэту

## Рашэнні XXI з'езда—у масы

МІНСКАЕ гарадское аддзяленне Таварыства па пашырэнню палітычных і навуковых ведаў БССР праводзіць вялікую работу па прапагандзе рашэнняў і матэрыялаў XXI з'езда КПСС. Дастаткова сказаць, што толькі ў лютым аддзяленнем Таварыства прачытана сярод насельніцтва 596 лекцый, каля паловы якіх былі прысвечаны прапагандзе планаў сямігодкі. Акрамя цыклавых лекцый, праводзяцца тэматычныя вечары: «Мы за партыяй ідзём», «Па-камуністычнаму жыць і працаваць», «Падарожжа па карце БССР у 1965 годзе» і інш. На прадпрыемствах і ва ўстановах арганізоўваюцца вусныя часопісы, сустрэчы з дэлегатамі XXI з'езда.

Значную частку гэтай работы праводзіць група членаў Таварыства — супрацоўнікаў Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна (старшыня прафесар Г. Г. Вінберг). Работнікамі універсітэта чытаецца каля 10 працэнтаў усіх лекцый у гарадскім аддзяленні. Значную дапамогу аказваюць камуністы Ф. Б. Баравік, В. А. Рабцэвіч, Г. С. Маханёк, Г. І. Якуб і інш. Часта выступаюць перад насельніцтвам прафесар М. М. Паўлючэнка, дацэнты Ф. М. Нячай, С. А. Пахута. Заслужанай павагай слухачоў карыстаюцца лекцыі камуністаў В. І. Мацко, В. Т. Петрыкава, І. І. Трухана.

Пленум гарадскога аддзялення Таварыства, які нядаўна адбыўся, намеціў шэраг новых мераў па далейшаму пашырэнню лекцыйнай работы і актывізацыі ўсіх членаў Таварыства. Многае трэба будзе зрабіць універсітэцкім лектарам. Сумесна з партыйным камітэтам група лектараў павінна забяспечыць рэгулярнае чытанне лекцый для рабочых і служачых падшэфных прадпрыемстваў—аўтазавода і завода імя Варашылава.

**Н. РУБІС,**

## ДОБРА ПРАЦАВАЛІ—ДОБРЫЯ І ВЫНІКІ

14 сакавіка адбыўся камсамольскі сход другога курса аддзялення журналістыкі. На сходзе падведзены вынікі зімовай экзаменацыйнай сесіі.

21 чалавек з 26 здалі ўсе экзамены на «добра» і на «выдатна». Сярод іх камсамольцы Анатоль Падбярозны, Нэля Кліменка, Ніна Загорская, Анатоль Залеўскі і іншыя.

Поспехі курса не выпадковыя. На працягу семестра ўсе студэнты добрасумленна адносіліся да вучобы, сістэматычна рыхтаваліся да практычных і семінарскіх заняткаў.

Плённа працавала на працягу ўсяго паўгоддзя і камсамольскае бюро курса. Камсамольскія сходы праводзіліся рэгулярна.

Усе студэнты выказаліся за тое, каб вясеннюю экзаменацыйную сесію здаць таксама толькі на «добра» і «выдатна», змагацца за ганаровае званне «лепшай групы на факультэце».

**В. КАВАЛЬКОЎ.**

## ПАДТРЫМАЕМ ПАЧЫН МАГІЛЕЎЧАН

11 сакавіка 1959 года адбылося чарговае пасяджэнне прафкома БДУ. Былі абмеркаваны пытанні аб пераводзе вучэбных карпусоў універсітэта на самаабслугоўванне, аб правядзенні падпіскі на газету «Беларускі універсітэт» і разгледжана фінансавая дзейнасць прафкома.

З асаблівай увагай члены прафкома выслухалі старшыню жыллёва-бытавой камісіі Ф. Камозу, які расказаў аб пачыне студэнтаў Магілёўскага педагагічнага інстытута, што перайшлі на самаабслугоўванне вучэбных карпусоў.

Каб выявіць магчымасці нашага студэнцкага калектыву, прафком вырашыў да 15 красавіка гэтага года праверыць стан самаабслугоўвання інтэрнатаў. Студэнты інтэрнатаў, прызнаных лепшымі, будуць прэміраваны каштоўнымі падарункамі, на набыццё якіх прафком і рэктарат адпусцілі неабходныя сродкі. Для правядзення агляду створана камісія з прадстаўнікоў прафкома, камітэта камсамола і студсавета пад старшынствам тав. Васіна.

Прынята таксама рашэнне аб правядзенні падпіскі на газету «Беларускі універсітэт».

Асноўны грашовы фонд прафкома, які расходуецца на культмасавыя патрэбы і матэрыяльную дапамогу студэнтам, складаюць членскія ўзносы. Аднак, не ўсе студэнты і члены прафбюро факультэтаў добрасумленна адносяцца да ўплаты і збору ўзносаў (юрыдычны і хімічны факультэты). Лепшым па зборы членскіх узносаў у гэтым годзе з'яўляецца філалагічны факультэт (старшыня прафбюро тав. Філончык).

**М. ПАПОЎ,** член прафкома БДУ.

## Хутка прэм'ера

Неўзабаве мы будзем падводзіць вынікі нашай працы за год у мастацкай самадзейнасці. Бурна ідзе падрыхтоўка да агляду мастацкай самадзейнасці на гістарычным факультэце.

Так, актыўна пачаў сваю работу драматычны гурток, якім кіруе член прафсаюзнага бюро факультэта Дзіна Сямёнава. Удзельнікі гуртка рыхтуюць да агляду п'есу Я. Купалы «Прымакі».

Актыўна ўдзельнічаюць у гуртку студэнты Мельзікаў, Ларыса Новік і іншыя. Будзем спадзявацца, што ўбачым цікавую пастаноўку.

*І. ПАВЯДАЙЛА,*
*старшыня прафбюро гістфака.*



*Калі вам патрэбна даведка аб той ці іншай літаратуры, звяртайцеся ў бібліяграфічны аддзел нашай бібліятэкі. Яго работніца Агнеса Андрэеўна Сінкевіч заўсёды прыдзе вам на дапамогу.*

*На здымку: Агнеса Андрэеўна Сінкевіч.*

У КАМІТЭЦЕ КАМСАМОЛА

## Актывісты—уперад

НА ДНЯХ адбылося пасяджэнне камітэта камсамола універсітэта. На парадку дня стаялі два злабадзённых пытанні работы камсамольскай арганізацыі: аб паляпшэнні спартыўнай работы і аб стане шэфскай работы.

Была адзначана важнасць тэрміновых мер, якія выцякаюць з гэтых пастаноў, па ўключэнню камсамольскіх арганізацый факультэтаў у барацьбу за ўсямернае ажыўленне спартыўнай работы ва універсітэце. Застрэльшчыкамі ў гэтай справе павінны быць, перш за ўсё, камсамольскія актывісты.

Кафедра фізвыхавання і спорту распрацавала шэраг канкрэтных мерапрыемстваў для таго, каб у кароткі тэрмін ажыццявіць масавую здачу норм ГПА. Даклад аб гэтым зрабіў загадчык кафедры Я. Р. Маркаў.

У студэнцкіх інтэрнатах уводзіцца ранішняя гімнастыка, якая дапаможа студэнтам упарадкаваць рабочы час.

—Калі актывісты першымі падымуцца на зарадку, то за імі падымуцца астатнія,—сказаў у сваім выступленні тав. Маркаў. І гэта так.

Намечана пабудаваць свой універсітэцкі стадыён, пляцоўка для якога ўжо ёсць, і летні спартыўны лагер у раёне Ганалеса. У будаўніцтве іх камсамольцы павінны адыграць рашаючую ролю.

Са справаздачай аб стане шэфскай работы выступілі члены камітэта камсамола А. Ванькевіч і С. Рудзяк.

Шырока разгарнулася шэфская работа на хімічным і гістарычным факультэтах. Камсамольскія ж арганізацыі біялагічнага, філалагічнага і юрыдычнага факультэтаў дрэнна арганізавалі шэфскую работу ў школах і на прадпрыемствах горада. Вырашана шырэй практыкаваць сустрэчы студэнтаў з членамі брыгад камуністычнай працы. Для каардынавання работы студэнтаў у піянерскіх арганізацыях школ і абмену вопытам ствараецца ва універсітэце Савет піянерважатых, які з'явіцца своеасаблівай школай піянерскай работы.



*Утульна ў ленпакоі інтэрната па Свярдлова. Таму тут і бывае заўсёды людна.* Фота М. ШОБЫ.

# КЛІЧУЦЬ НАС ШЫРОКІЯ ДАРОГІ...

☆ ☆ ☆

## *Гавораць выпускнікі*

### ФОТАРЭПАРТАЖ

*У ЛАБАРАТОРЫІ арганічнай хіміі студэнты-выпускнікі праводзілі доследы па тэмах сваіх дыпломных работ. Ад рэзкага паху нейкага рэчыва нас з непрывычкі апанаваў кашаль. Хімікі пасмейваліся, але калі даведаліся, што мы хочам пра іх напісаць, выпусцілі супроць нас слёзатачывы газ з нейкай мудрагелістай назвай. Але ўсе іх спробы пазбавіцца ад гасцей былі дарэмнымі. Нічога не заставалася, як пазнаёміцца і пагутарыць па душах.*



*З вялікай цікавасцю працуюць выпускнікі. Тэмы іх дыпломных работ маюць практычнае значэнне. Вось што расказаў нам дыпламант Генадзі Ламец: (здымак злева).*

*— Вывучаю ўмовы, пры якіх лепш за ўсё кандэнсуецца адно новае рэчыва, якое знойдзе сваё прымяненне ў медыцыне і ў іншых галінах народнай гаспадаркі. Гэтие рэчыва знаходзіцца яшчэ ў стадыі вывучэння і лабараторных даследаванняў, і я пад кіраўніцтвам дацэнта В. Ф. Бяляева з цікавасцю працую над вывучэннем яго ўласцівасцяў. Хутка ў нас размеркаванне на працу. Многія з маіх таварышаў пойдуць працаваць на заводы. Што ж датычыцца асабіста мяне, я паеду туды, дзе я больш патрэбны і дзе змагу прынесці больш карысці.*

*Мы пажадалі далейшых поспехаў хімікам і накіраваліся да студэнтаў біяфака. У кабінеце мікрабіялогіі пяцікурсніца Таня Лебедзева (здымак справа) расказала нам аб тым, як яна са сваёй сяброўкай Алай Жыгалковіч працуе над вывучэннем азотабактэру.*

*— Азотабактэр, — гаворыць яна,—гэта свабодна жывучы аэробны фіксатар азоту атмасферы. Шырока сустракаецца ён і ў глебе, і ў вадзе. Ён узбагачае глебу азотам і тым самым спрыяе павышэнню ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур і часта выкарыстоўваецца для прыгатавання бактэрыяльных угнаенняў. Мэта нашай працы—вызначыць на аснове даследаванняў ступень радства і адрознення паміж трыма відамі роду азотабактэра. Работа вельмі цікавая, і мы з захапленнем працуем над ёй.*

*Выпускнікоў-журналістаў Сямёна Блатуна, Уладзіміра Чэпікава і Анатоля Спірыдонава (здымак унізе) мы сустрэлі каля інтэрната. Сябры абсыпалі адзін аднаго апошнім, пацямнеўшым ужо снегам. Моцна здружылася гэтая тройка за гады вучобы. Сямён Блатун прачытаў нам свой новы верш, прысвечаны хуткаму развітанню з родным універсітэтам, сябрамі.*

### Сябрам на развітанне

Забудзеш хіба наш вясёлы час  
І шчырасць шматгадовай  
дружбы?  
Як гуртам мы пілі студэнцкі  
чай,  
Які ў жарт назвалі «белай  
ружай».  
Ці ж ты забудзеш родны  
інтэрнат,  
Што пяць гадоў служыў  
бацькоўскай хатай,  
Дзе песня прагучэла не  
адна,  
Бо тут жылі вясёлыя  
дзяўчаты.  
І не забудзецца, як першы раз  
Ты запрасіў яе ў кіно  
нясмела...  
Прайшла яна, цудоўная пара,  
Не, не прайшла—на крыллях  
праляцела.  
Былі яны не ціхімі, гады—  
У бурных спрэчках, гаварках  
дэбатах...  
Іх памяць захавае назаўжды  
І вас, сябры,  
харошыя рабяты!



*Шырокія дарогі адкрыты перад юнакамі і дзяўчатамі, якія пакідаюць сцены роднага універсітэта. Мы ўпэўнены, што куды б ні закінуў іх лёс, яны назаўсёды захаваюць самыя светлыя ўспаміны аб шчаслівых студэнцкіх днях.*

С. ПАЛЯКОЎ і А. АСТАПОВІЧ.



☆

### Шчаслівай дарогі, сябры

Засталіся лічаныя дні нашага жыцця ва універсітэце. Аб ім, аб выкладчыках і студэнтах у нас застануцца самыя светлыя ўспаміны. Тут мы пасябравалі, набылі патрэбныя веды, атрымалі пуцёўку ў жыццё.

А зараз у нашых філолагаў вельмі напружаны час. Яны пішуць дыпломныя работы. Асабіста я пішу дыпломную работу на беларускай мове. Тэма работы «Назіранні над мовай вершаў Багушэвіча». Моўныя асаблівасці вершаў Багушэвіча не распрацаваны, так што даследаваць ёсць шмат чаго. Работа хоць і цяжкая, але цікавая. У многім мне дапамагае мой навуковы кіраўнік Л. М. Шакун.

А вось яшчэ адна важная падзея ў жыцці пяцікурснікаў. З нецярплівасцю чакаюць студэнты нашага курса размеркавання на працу. А яно ўжо хутка. Як пераважная большасць маіх аднакурснікаў-філолагаў, так і я сама ўжо даўно вырашылі ехаць працаваць па прызначэнню, туды, куды пашле нас Радзіма. Хочацца пажадаць, каб кожны з маіх сяброў заняў сваё месца ў жыцці, аддаў усе свае сілы на працу, каб мае аднакурснікі выхоўвалі ў дзяцей самыя светлыя пачуцці ў адносінах да людзей, Радзімы, выхоўвалі сапраўдных будаўнікоў камунізма.

Шчаслівай дарогі ў жыццё, дарагія сябры!

Жадаем вам поспехаў!

ЛІДЗІЯ КУЦУН.

### ХАЙ ПОСПЕХ СПАДАРОЖНІЧАЕ ВАМ

ПРАХОДЗЯЦЬ АПОШНІЯ месяцы і дні цудоўнага студэнцкага жыцця. Ніколі не сатруцца ў памяці ўспаміны аб студэнцкай дружбе, аб нашых думках, у якіх было многа, а часамі і вельмі многа рамантыкі.

Не раз успомніцца тое хваляванне за таварыша, за сябе, якое адчуваеш у час экзаменацыйнай сесіі.

І яшчэ многа, вельмі многа захавае ўчэпістая памяць.

Цяпер у маіх таварышаў і ў мяне вельмі гарачы час. Пішам дыпломныя работы, хутка—іх абарона, дзяржаўныя экзамены! Уперадзе яшчэ многа цяжкасцяў.

Часта ў вольны час мы гаворым аб сваёй будучай рабоце, аб тым, што вось-вось зноў вернецца 1 верасня і мы, тыя, што 5 гадоў назад пакінулі школу, зноў вернемся ў яе, але наша роля ў ёй цяпер зусім зменіцца. Вернемся мы настаўнікамі — выхавацелямі новага пакалення. Прафесія настаўніка—мая любімая прафесія. Калі перада мной паўставала пытанне: «Кім быць?» —я не вагалася ні секунды. А цяпер мара збываецца. Я з нецярплівасцю чакаю размеркавання.

І вельмі хочацца хутчэй у школу. Нялёгка прадказаць цяпер, якія цяжкасці сустрэнуцца ў школе. А што яны будуць, няма сумнення. Шлях да поспеху заўсёды ідзе праз цяжкасці. Бадай што без іх і не было б цікава. Трэба толькі любіць сваю справу, імкнуцца да дасягнення пастаўленай мэты.

Няхай толькі поспех спадарожнічае ўсім маім сябрам, таварышам, аднакурснікам!

Прыдзецца многа і настойліва працаваць над сабой, паглыбляць і расшыраць тыя веды, якія мы атрымалі ва універсітэце. І гэта нядзіўна, таму што працу і вучобу нельга аддзяляць.

Але самае галоўнае ў нас ужо ёсць—гэта любімая прафесія.

Л. ЗАСМУЖАЦ,
студэнтка 5 курса гістфака.

*Весна врывается в город,*  
*Весна врывается в сны.*  
*Я поднимаю ворот, —*  
*Я не хочу весны.*  
*Весна для всех радость*  
*огромная,*  
*Я же смотрю иначе —*  
*Весна—это значит*  
*дипломная,*  
*Которую я не начал.*



Фотажарт Э. САБАЛЕНКІ.

### ШМАТ ВАДЫ

ШМАТ ВАДЫ сплыло з таго часу, калі мы, выпускнікі дзесяцігодкі, адны са школьнай парты, другія з радоў Савецкай Арміі, з прадпрыемстваў і калгасных палёў, уліліся ў дружную сям'ю студэнтаў юрыдычнага факультэта.

Зараз нельга не ўспомніць тыя дні без хвалявання, калі многія з нас кожны дзень, праглядаючы газеты з рубрыкай «Куды пайсці вучыцца», выбіралі сабе дарогу ў жыццё—светлае і радаснае.

Здадзены ўступныя экзамены, і як прыемна адчуваць, што кожны з нас стаў часцінкай вялікага студэнцкага калектыву юрыдычнага факультэта. І гэта не выпадкова. Спытайце сёння, якая прафесія мне лепш за ўсё падабаецца, і я адкажу, бадай што не задумваючыся—прафесія юрыста.

## Рамантычная прафесія

Адказная, карпатлівая і разам з тым рамантычная работа. Адказная і карпатлівая таму, што нам, юрыстам, заўсёды прыдзецца мець справу з жывымі людзьмі, ды яшчэ з якімі людзьмі.

Вось перад табой сядзіць забойца, злодзей, парушальнік грамадскага парадку або яшчэ які-небудзь нядобры чалавек—людзі з рознымі характарамі і нават рознымі поглядамі на жыццё. Многія з іх зрабілі злачынства ўпершыню ці па неасцярожнасці, а другія — заядлыя злачынцы.

Да кожнага з іх трэба знайсці ключ, каб раскрыць злачынства і пакараць вінаўнага. Але не толькі пакараць, галоўнае—зрабіць з яго сапраўднага чалавека, зноў паставіць на правільны шлях жыцця.

І, мабыць, кожнаму з нас патрэбна быць пастрабавальным, нават строгім і разам з тым гуманным як да сябе, так і да ўсіх тых, з кім прыдзецца мець справу.

А чаму рамантычная? О, гэтага я вам не скажу. Здагадайцеся самі. Ну, добра. Не буду адымаць у вас часу, бо многія з вас і так спяшаюцца з лекцый ці яшчэ адкуль у кіно, тэатр, цырк. Скажу сам.

Раптам у дзяжурным пакоі аддзялення міліцыі зазваніў тэлефон.

—Ало,... Слухаю вас, так, так, зразумела, зараз выязджаю.

І вось аператыўная група імчыцца на матацыкле на месца здарэння, дзе машына падбіла пешахода. Не губляць ні адной мінуты, хутчэй дагнаць і затрымаць злачынцу.

Скажаце, не рамантычна? Памыляецеся...

Пяць гадоў карпатлівай вучобы застаюцца ззаду. Не раз прыходзілася хвалявацца перад здачай кожнага экзамена і яшчэ больш радавацца і з палёгкай уздыхаць, гаворачы «пранесла».

І так кожную хвіліну і на кожным кроку.

Вось і цяпер стаім перад аўдыторыяй, дзе зараз пачынаецца размеркаванне на работу. Тут таксама нельга абыйсціся без хвалявання. Гэта другі крок кожнага з нас у жыццё.

Адзін за адным выходзім з аўдыторыі бадзёрымі.

Рабяты віншуюць толькі што вышаўшага Кучарава з напраўленнем на работу ў Казахстан, потым Гайтуна, ён едзе ў Комі АССР. І. Волкаў пажадаў ехаць у Чыцінскую вобласць.

Многія застаюцца працаваць у Беларусі. Вось напрыклад Б. Серафімовіч і В. Левы—пакінуты ў аспірантуры.

І ўсе мы, дзе б кожны з нас ні працаваў: следчым у органах пракуратуры, міліцыі, суддзёй ці адвакатам—безумоўна справімся з адказнай задачай, ускладзенай на нас Камуністычнай партыяй, Савецкім урадам, нашым народам і дзяржавай.

Не падвядзём таксама і нашых паважаных выкладчыкаў. Наша пачэсная і высакародная праца няхай будзе вялікай падзякай ім.

Вялікіх поспехаў вам, дарагія сябры-юрысты, у добрай працы і жыцці і вам, дарагія і паважаныя выкладчыкі юрыдычнага факультэта!

Г. ГАНЧАР.

НАШ КАЛЯНДАР

# ВЯЛІКІ РУСКІ КАМПАЗІТАР



ЗАЎТРА спаўняецца 120 год з дня нараджэння вялікага рускага кампазітара Мадэста Пятровіча Мусаргскага. У музыцы Мусаргскага знайшлі сваё яркае адлюстраванне рэвалюцыйна-дэмакратычныя ідэі 60-х гадоў XIX стагоддзя.

Яшчэ ў дзяцінстве на будучага кампазітара вялікае ўражанне зрабіла знаёмства з паэтычнай народнай творчасцю і, асабліва, магутнай песеннай стыхіяй рускага народа. Пазней пад уплывам рэвалюцыйна-дэмакратычнай літаратуры і журналістыкі 60-х гадоў фармуюцца матэрыялістычныя і антыпрыгонніцкія прынцыпы і асноўны змест яго твораў у перыяд творчай сталасці.

Народнасць і рэалізм творчасці Мусаргскага ярка праявіліся ў яго вакальных творах з сялянскага жыцця, напісаных у сярэдзіне і ў другой палове 60-х гадоў. Гэта «Калістрат» і «Калыханка Яромушкі» на словы М. А. Някрасава, «Спі, засні, сялянскі сын» на словы А. М. Астроўскага, «Гапак» на тэкст паэмы «Гайдамакі» Т. Р. Шаўчэнкі, «Свецік Савішна» і «Сіротка» на ўласныя тэксты. У своеасаблівых музычных памфлетах «Класік» і «Раёк» кампазітар трапна і востра высмейвае працiўнікоў «магутнай кучкі».

У той жа час Мусаргскі стварае глыбокапаэтычныя лірычныя рамансы «Па-над Донам сад квітнее» на словы А. В. Кальцова, «Ноч» па А. С. Пушкіну і многа іншых твораў, у якіх выявілася тонкая псіхалагічная назіральнасць кампазітара, яго ўсхваляванае бачанне свету, прыроды, любоў да чалавека і жыцця.

У 1868—69 гадах Мусаргскі напісаў оперу «Барыс Гадуноў» па трагедыі А. С. Пушкіна, якая з'явілася адной з вяршыняў творчасці кампазітара. Оперу варожа сустрэлі правячыя колы царскай Расіі, але яна мела надзвычай вялікі поспех у дэмакратычнай публікі. Кампазітар шукае выражэння карэнных ідэйных праблем таго часу, імкнецца паказаць рашаючую ролю народных мас у гісторыі, раскрывае высокую маральную чысціню і прыгажосць духоўнага вобліку людзей з народа.

Ахарактарызаваўшы сваю оперу «Хаваншчына» як «народную музычную драму» кампазітар тым самым свядома вызначыў асноўную ролю народа ў яе дзеянні.

Глыбокія і самыя затаёныя чалавечыя пачуцці і настроі з безліччу нюансаў і адценняў спалучаюцца ў музыцы Мусаргскага з эпічнай шырынёй, з д'ябальскім смехам над нікчэмнасцю манархіі і манархаў.

Параўнайце, напрыклад, песню «Сіротка» і баладу «Забыты» з операмі «Барыс Гадуноў» і «Хаваншчына», твор «Свецік Савішна» з сатырычнай «Песняй» Мефістофеля» («Блыха») і вы заўважыце, што вострая жанравая характарыстычнасць і майстэрства паказу народных мас злучаліся ў Мусаргскага з выключнай глыбінёй пранікнення ў духоўны свет чалавека; задушэўныя настроі і вясёлы смех звінеў разам з громам гнеўнай сатыры.

Творчая спадчына Мусаргскага карыстаецца глыбокай любоўю ўсяго савецкага народа і надзвычай высока ацэньваецца многімі народамі свету.

А. ПЕТУХ.

# З ФОТААПАРАТАМ ПА ІНТЭРНАТУ

*ІНТЭРНАТ БДУ па Свярдлова. Дзяжурная Галя Злотнікава (II курс гістфака) з галавой увайшла ў чытанне. Не будзем яе непакоіць, зойдзем у корпус. Там знаходзім старшыню студкома Міхаіла Лук'яненка. Разам з ім і іншымі членамі камісіі абходзім пакоі. Міхаіл спакойны:*

*— У большасці пакояў у нас парадак.*

*— Ну што ж, паглядзім.*

*Першыя ўражанні: у дзяўчат непараўнальна чысцей, чым у хлопцаў. Гэта, як гавораць, натуральна. Можа таму так весела і ўсміхаюцца гэтыя дзяўчаты (фота 1), што ў іх пакоі ідэальная чысціня, стаіць трумо, радуюць вока беласнежныя навалочкі і просціны.*





*Але не ва ўсіх, мусіць, так. У многіх пакоях з нашым паяўленнем катастрафічна павялічвалася колькасць «хворых». Прычына простая—з хворых і запытання няма. А дзяўчаты з 53 пакою замкнуліся на ключ. А брудна ў іх ці чыста—здагадайцеся самі.*

*Хто аўтар гэтага мудрагелістага нацюрморту? Паглядзі, чытач, чаго тут толькі няма! Побач са шчоткай для абутку горда ўзвышаецца чайнік, справа выстраіліся бутэлька кефіру, пачак цукру, кубак, лыжка. У Івана Броўкіна (гэта яго партрэт заканчвае гэтую калекцыю) нават валасы ўстаюць дыбам: «Ну і парадачак!». Гэта калектыўная творчасць жыхароў 125 пакою. Аднак наўрад ці атрымаюць яны за яе першую прэмію на конкурсе на лепшы пакой.*

*Гэта ў хлопцаў.*

*А вось у дзяўчат. Ці не праўда, гэты маляўнічы куток нагадвае адначасова і галантарэйны, і букіністычны магазін у час перападліку. Вось аграмістая дамская сумачка. А побач яшчэ большая кіпа нядбайна складзеных кніг, увянчаная не першай чысціні ручніком. А мыльніца і адна з прыналежнасцяў дамскага туалету зусім някепска ўладзіліся на падаконніку ў суседстве з падручнікам нямецкай мовы і канспектамі. Ложкі ж выглядаюць так, быццам над імі толькі што пранёсся самум—злы вецер пустыні. Так жывуць жыхаркі 44 пакою, дзе староста Алешкіна. Нічога не скажаш — «дзявочая акуратнасць». Гора, гора таму, каго лёс ашчасліваць такой жонкай!*



*Фота і тэкст*
*А. РАДУЦКАГА.*



Аказваецца, слухаць серанады можна не толькі на балконе, але і ў даволі непрытульным вестыбюлі інтэрната па Кірава. Ад гэтага прывабнасць іх нікольки не зніжаецца.

Фотаэцюд М. ШОБЫ.

# ДЗЕНЬ „ЗАНЯТАГА" СТУДЭНТА

## ДРАМАТЫЧНАЯ СЦЭНА

Дзеючыя асобы:

Рыгор Непаспей—студэнт 2—4 курса.

Яўген—студэнт, сябра Рыгора.

Дзяжурны па інтэрнату.




### З'ЯВА І

8 гадзін раніцы. Адкрываецца заслона. На першым плане —студэнцкі ложак. На ложку спіць чалавек. Самога чалавека не відаць, бо галава яго схавана пад прасцінёй. Чалавек не думае прачынацца. Раптам да дзвярэй падыходзіць дзяжурны па інтэрнату студэнт і пачынае дробненька стукаць.

**Дзяжурны:** Рыгор! Уставай, прасіў жа! (Чалавек на ложку паварочваецца. Высоўвае з-пад прасціні галаву—гэта Рыгор Непаспей).

Рыгор: Добра, дзякуй... я зараз.

### З'ЯВА 2

9 гадзін раніцы. Тая ж сцэна, за выключэннем некаторай змены ў палажэнні заснуўшага. Цяпер ён спіць на левым баку.

### З'ЯВА 3

10 гадзін раніцы. Спачатку тое ж самае, што і ў папярэдніх сцэнах. З-пад прасціні паказваецца галава. Потым працiраюцца рукі. Чуецца пакрэхтванне «э-эх!»

**Рыгор:** Устаць бы цяпер! (зноў заплюшчвае вочы). А сон салодкі... (паварочваецца на другі бок і раптам):

— А згарыць яно! Колькі таму чалавеку жыць на свеце, ды каб не паспаць удосталь. Вечна спяшайся некуды (рашуча)— Няма дурных! (Нацягвае на галаву прасціню).

### З'ЯВА 4

11 гадзін 30 хвілін. Адкрываецца заслона.

**Рыгор:** (хістаючыся, засцілае ложак). Зноў праспаў! А, чорт яго пабраў! (Кпіць над сабою). Воля называецца—устаць не магу... Абломаў другі! (пачынае гарачыцца) Ох, ёлкі зялёныя! Куды ж цяпер—у бібліятэку ці ў сталовую? Ай, не мыўся ж яшчэ. (хапае мыльніцу, цюбік з пастай і бяжыць у туалет).

### З'ЯВА 5

14 гадзін. Пакой інтэрната. Пасярэдзіне яго Непаспей.

**Рыгор:** Ну, здаецца, усё. У туалеце быў (адлічвае на пальцах), у сталовай—быў, у цырульні—быў. Пайду ў бібліятэку. (глядзіць на гадзіннік) Стаіць! (прыкладае да вуха). Не, ідзе. Няўжо гэта ўжо трэцяя гадзіна?! (выбягае ў калідор і крычыць: «Генка! Колькі на тваім?»—Чуецца голас: «Пяць хвілін трэцяй!»

### З'ЯВА 6

Ідзе 4-ая гадзіна. Пакой у інтэрнаце. За сталом двое: Рыгор Непаспей і яшчэ студэнт—Яўген (ён з першай змены). Гуляюць у шашкі.

**Рыгор:** Жэня, кідаем! Мне трэба хоць на другую гадзіну першай лекцыі паспець...

**Яўген:** (глядзіць на гадзіннік)—Спознішся! (раптам)— Ды перастань ты! Не быў на першай гадзіне, дык хочаш на другой у вочы выкладчыку лезці.

**Рыгор:** (згаджаецца). Яно і праўда (бярэ шашкі). Стаў!

### З'ЯВА 7

10 гадзін вечара. Тыя ж гуляюць у шашкі.

**Рыгор:** (да сябра). Сёння быў сход. Гаварылі аб перагрузцы студэнтаў. Выступаў таксама. Націскаў на тое, што часу няма.

**Яўген:** Ну і што?

**Рыгор:** Падвёў староста: «Ты, Непаспей,—кажа на мяне, —лепш скараціў бы час для сну... (перастаўляе шашку). Б'ю!

**Яўген:** (падсоўвае другую) Ну, а ты?

**Рыгор:** А я кажу, смяяўся кацёл з гаршка...

### З'ЯВА 8

Першая гадзіна ночы. На сцэне—стол дзяжурнага. Перад ім—Рыгор Непаспей. Піша на газеце, што разаслана на стале: «Прашу разбудзіць мяне заўтра ў 8 гадзін раніцы—26 пакой». (распісваецца) Рыгор Непаспей.

### АПОШНЯЯ З'ЯВА

Любая гадзіна ночы. За сталом—той жа дзяжурны. Бачыць запіс. Чытае, потым усміхаецца: «Эх ты, наіўнасць!»

Ігар ХАДАНОВІЧ.

## Прымайце ўдзел у нашым конкурсе

Рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» у гонар дня Друку аб'яўляе конкурс на лепшы нарыс, фельетон і гумарэску, рэпартаж і фотарэпартаж, артыкул і карэспандэнцыю, замалёўку, фотаздымак, фотаэцюд, малюнак і карыкатуру. Устаноўлена 15 наступных прэмій:

За нарыс:
Адна першая—200 рублёў.
Адна другая—150 рублёў.

За фельетон і гумарэску:
Адна першая—175 рублёў.
Адна другая—150 рублёў.
Адна трэцяя—100 рублёў.

За рэпартаж і фотарэпартаж:
Адна першая—150 рублёў.
Адна другая—100 рублёў.

За артыкул і карэспандэнцыю:
Адна першая—120 рублёў.
Адна другая—80 рублёў.

За замалёўку:
Адна першая—100 рублёў.
Адна другая—75 рублёў.

За фотаздымак, фотаэцюд, карыкатуру і малюнак:
Дзве першыя—па 75 рублёў.
Дзве другія—па 50 рублёў.

Апошні тэрмін здачы матэрыялаў на конкурс—30 красавіка.

Прымайце ўдзел у нашым конкурсе!

Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 60; тэл. 2-07-19.

АТ 03116 Друкарня выдавецтва БДУ імя Ул. І. Леніна. Тыраж 2000 экз. Зак. 358